# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ПРАЦЫ ЯЗЭПА ДРАЗДОВІЧА МАСТАКОМ-ДЭКАРАТАРАМ У БЕЛАСТОЦКІМ ДРАМГУРТКУ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

***І. А. Алексніна,***
*дацэнт кафедры тэатральнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства*

Язэп Драздовіч (1888–1954) – выдатны дзеяч беларускай культуры, «першы касьміст», беларускі Ніка Пірасманішвілі і Леанарда да Вінчы, чалавек неардынарных здольнасцей і шматгранных талентаў. Акрамя жывапісу, мастак займаецца разьбой па дрэве, графікай, лінгвістыкай, астраноміяй, этнаграфіяй, фалькларыстыкай, літаратурнай творчасцю ў прозе і паэзіі.

На яго духоўнае фарміраванне яшчэ ў час вучобы ў майстэрні вядомага віленскага прафесара Івана Трутнева аказалі ўплыў удзел у студэнцкіх вечарынах, сустрэчы з артыстамі трупы Ігната Буйніцкага, удзельнікамі хору Рыгора Шырмы, супрацоўнікамі рэдакцыі «Нашай нівы» і Беларускага музея ў Вільні.

На станаўленне грамадскіх і творчых светапоглядаў Язэпа Нарцызавіча аказала пэўнае ўздзеянне знаёмства і супрацоўніцтва з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Вацлавам Ластоўскім, Канстанцыяй Буйло, Максімам Танкам, сяброўства з Пятром Сергіевічам, Янам Пачопкам, Міхасём Машарам.

Магчыма, менавіта пад моцным уплывам ідэй тагачаснага адраджэння беларускай культуры яшчэ ў 1919 г. у вёсцы Германавічы Язэп Драздовіч заснаваў першае на тэрыторыі Заходняга Паазер'я культурна-асветнае таварыства «Заранка» і бібліятэку, якой падараваў 10 асобнікаў. Таварыства адрознівалася масавасцю: нават у час стварэння налічвала 110 членаў [2, с. 121]. У Статуце гэтай дабравольнай арганізацыі адным з кірункаў дзейнасці значылася пастаноўка тэатральных спектакляў. Першы з іх вырашана было паказаць на другі дзень Вялікадня [2, с. 122–123], аднак, ці давялося давесці задуманае да мэты, дакументальна не пацверджана.

Дакладна вядома аб больш познім супрацоўніцтве Язэпа Драздовіча з аматарамі беларускай сцэны, але ўжо не на тэрыторыі Заходняга Паазер'я, на Беласточчыне. Апынуўшыся там у 1933 г., мастак прымае актыўны ўдзел у пастаноўках гуртка Таварыства беларускай школы (ТБШ) у якасці мастака-дэкаратара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследчык тэатральнай культуры Заходняй Беларусі Арсен Аляксандравіч Лабовіч лічыў працу гэтага калектыву цікавай і значнай, аднак абмяжоўваў часавы перыяд яго дзейнасці 1927–1931 гг. Аднак, абапіраючыся на дакументальныя звесткі, занатаваныя ў «Дзённіках» Язэпа Драздовіча, мы можам не толькі пашырыць часавыя рамкі творчасці беластоцкай тэатральнай дружыны да 1933 г. [1; 3], але і вызначыць прычыны спынення дзейнасці гэтага беларускага тэатра.

20 сакавіка 1933 г. мастак пакідае наступны запіс, які сведчыць аб пачатку супрацоўніцтва з аматарамі тэатра ў Беластоку: «...распачаў маляваць дэкарацыю-ланшафт для ТБШ» [3, с. 123]. Відаць, праца над гэтымі дэкарацыямі вымагала найхутчэйшага яе завяршэння, бо мастак заканчвае яе ўжо праз два дні, а ў дзённіку каротка заўважае: «... дэкарацыю-краявід марэнна-лясістага характару (на воддалі лес, узгор’е, рэчка, узгоркі, а па ўзгорках – бярозавыя гайкі. Назбліжжу ўзмёт з альшынкамі і дубамі і г.д.) – закончыў» [3, с. 126]. Праз шэсць дзён «...зрабіў падгатоўку (выкрайкі і падмалёўка) бакавіц лесу – для аматараў сцэны Беластоцкай арганізацыі ТБШ» [3, с. 123]. У наступным месяцы дэкаратар працуе над тыльнікам «Пушча», якую, «... незважаючы на недахоп фарбаў, усё ж такі закончыў. Няхай і яшчэ прыбавіцца хоць адной рэччу для ўпрыгожвання аматарскай сцэны ТБШ» [3, с. 126].

Далей Язэп Нарцызавіч не толькі пакідае кароткія звесткі аб сваёй дэкарацыйна-афармленчай дзейнасці, але і занатоўвае невялікія рэцэнзіі на спектаклі, напрыклад, адносна паказаў па камедыі Марка Крапіўніцкага «Пашыліся ў дурні». Адзін з іх быў пастаўлены гуртком таварыства ў Супраслі, другі – на беластоцкай сцэне. Вядома, што дэкарацыйнае вырашэнне гэтых пастановак было здзейснена Язэпам Драздовічам. Мастак адзначае паспяховасць першага спекталя: «... публікі было шмат. А галоўнае – зацікаўленасць. Супрасляне аказаліся найшмат тэатральнейшымі за беластаччан, якія ідуць на спектакль толькі дзеля танцаў» [3, с. 126]. Пасля другога спектакля аўтар дзённіка заклапочана заўважае: «... сама сцэна з маімі дэкарацыямі мела выгляд дужа прыстойны, ды, на вялікі жаль, таніцеляў на ўсё гэта не хапала. Публікі было шмат. Моладзь уборная, франтаватая, але эстэтычна не развітая. Танцы» [3, с. 127].

Як вынікае з красавіцкіх запісаў, у гуртка не хапае сродкаў не толькі на выплату запрацаванага мастаком ганарару, але і на фарбы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для заканчэння тыльніка [1, с. 101; 3, с. 126–128]. Нягледзячы на такія абставіны, Язэп Нарцызавіч працягвае працаваць на карысць таварыства. У канцы мая Драздовіч піша яшчэ адзін, чацвёрты, вялікі тыльнік-экран пад назвай «Замчышча». З-за недахопу парусіны мастак малюе яго на адваротным баку «Пушчы» і паспяхова завяршае працу над ім праз чатыры дні. Апошні запіс, які тычыцца дзейнасці тэатральнага гуртка ТБШ, сведчыць аб пастаноўцы твора «Страхі жыцця» Францішка Аляхновіча: «...М. Андрэйчык (ён жа і рэжысёр), Яблыкаў і пані Сідаровіч разыгралі п’есу вельмі добра. Толькі, на вялікі жаль, глядзельнікаў было вельмі мала» [1, с. 106].

Такім чынам, менавіта грунтуючыся на дакументальных звестках прафесійнага мастака, які займаўся яшчэ і падрыхтоўкай дэкарацый для аматараў-тэатралаў, мы можам зрабіць выснову, што спыненне дзейнасці драмгуртка Таварыства беларускай школы ў 1933 г. было выклікана дзвюма асноўнымі прычынамі: з аднога боку, гэта быў недахоп матэрыяльных сродкаў для пастановачнай работы, з другога – страта цікавасці беластоцкай публікі да беларускамоўных пастановак.


1. *Драздовіч, Я.* Дзённік / Я. Драздовіч // Маладосць. – 1995. – № 5. – С. 117–128.

2. *Драздовіч, Я.* Дзённік / Я. Драздовіч // Маладосць. – 1995. – № 6. – С. 101–107

3. ЦДАКР БССР. – Ф. 766. – Воп. 1. – Адз. 8.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ